# СУЧАСНЫЯ ВЫКЛІКІ, З ЯКІМІ СУТЫКАЕЦЦА МІЖНАРОДНЫ СУД АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ І ШЛЯХІ ІХ ВЫРАШЭННЯ

**М. І. Шайбак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*mshaybak02@gmail.com*
*нав. кір. – І. В. Шарыпіна*

Артыкул прысвечаны аналізу сучаснага становішча Міжнароднага Суда Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (далей – ААН) як асноўнага судовага органа ААН, а таксама аналізу праблем, з якімі сутыкаецца Міжнародны Суд падчас сваёй дзейнасці. Таксама ў артыкуле прапанаваны шэраг рэформ складу і структуры Суда ААН, якія, на думку аўтара, могуць спрыяць павышэнню эфектыўнасці Суда, разам з аналізам прадбачаных перашкод ажыццяўлення дадзенай ініцыятывы.

***Ключавыя словы:*** Міжнародны Суд ААН; рэформы Міжнароднага Суда ААН; склад Міжнароднага Суда ААН; структура Міжнароднага Суда ААН; праблемы рэфармавання Міжнароднага Суда ААН.

Міждародны Суд адыгрывае вялікую ролю ў працэсе фарміравання норм права. Ён забяспечвае магчымасць суіснавання звычайных правоў розных дзяржаў, дапаўняе і сістэматызуе права, а таксама спрыяе фарміраванню агульнай практыкі. Аднак з цягам часу, праз з'яўленне новых міжнародных і рэгіянальных судовых органаў шырокай кампетэнцыі, Міжнародны Суд пачынае зазнаваць крызіс. Такія крызісы з'яўляюцца нязовымі ў гісторыі функцыянавання гэтай структуры [1].

· Да асноўных інстытуцыйных праблем Суда далучаюць давер і папулярнасць звароту ў Суд сярод дзяржаў сусветнай супольнасці, пытанні фінансавання, а таксама наяўнасць вялікай колькасці іншых міжнародных судовых органаў з аналагічнай кампетэнцыяй.

· Да працэсуальных праблем аднесці неабавязковасць выканання судовых пастаноў, часовых мер, а таксама абмежаваны доступ у Міжнародны Суд суб'ектаў міжнароднага права [2].

Іншымі словамі, асноўнай праблемай Міжнароднага Суда з'яўляецца абмежаванасць яго магчымасцяў, што, адпаведна, аказвае ўплыў на эфектыўнасць яго функцыянавання. Гэта і абумоўлівае неабходнасць рэфармавання дадзенай судовай структуры.

У выніку аналізу існуючых ўнутраных цяжкасцей Суда, меркаванніяў навукоўцаў і саміх супрацоўнікаў Суда, у тым ліку Старшыні, былі прапанаваны наступныя рэформы з мэтай павышэння эфектыўнасці дзейнасці Міжнароднага Суда ААН:

· забеспячэнне пяці судзейскіх месцаў для прадстаўнікоў дзяржаў-членаў Савета Бяспекі ААН;

· увядзенне ў якасці дадатковага патрабавання для кандыдатаў на пасаду суддзі наяўнасць экспертных ведаў не толькі ў галіне міжнароднага, але і нацыянальнага права;

· павелічэнне колькасці судовых сакратароў да 15, з мэтай замацавання за кожным суддзёй аднаго справавода;

· разгляд пытання аб увядзенні дадатковай пасады Генеральнага адваката або працэдуры сусветнага ўрэгулявання [3; 4].

Разам з канстатацыяй неабходнасці рэфармавання Міжнароднага суда ААН нельга абысці ўвагай і цяжкасці пры выканні азначаных навуводзін:

· вялікае значэнне аднагалоснага рашэння саміх дзяржаў аб неабходнасці рэфармавання Міжнароднага Суда ААН;

· далікатнае стаўленне да ўсіх пераўтварэнняў Суда;

· неабходнасць дадатковага фінансавання для падтрымкі працы Суда;

· складанасць працэдуры ўнясення выпраўленняў у Статут ААН.

Такім чынам, у сучанасці праблемы рэфармавання галоўнага судовага органа ААН - Міжнароднага Суда ААН, з мэтай узмазнення эго эфектыўнасці і ролі ў барацьбе за ўсталяванне міжнароднага міру і беспекі, набываюць усе большую актуальнасць. Шмат спецыялістаў міжнароднага права адзначаюць наспелую неабходнасць ажыццяўлення рэформ дзеля забеспячэння выканання азначаных у Статуце цэлей і задач. Прапанаваныя ў гэтай рабоце рэформы могуць слушным сродкам для дасягнення гэтай мэты. Аднак, варта адзначыць, што імгненная ажыцццяўленне новаўводзінаў немагчыма праз сур’езныя перашкоды, з якімі сутыкаецца Суд на працягу сваёй дзейнасці.

**Библиографические ссылки:**


1. Гончарова, Н. Н. Международный Суд ООН: пути повышения его эффективности: автореф. дисс. … канд. юр. наук: 12.00.10 / Н. Н. Гончарова. – Казань, 2007. – 34 с.
2. Дельвер, Ю. С. Современные проблемы Международного Суда ООН / Ю. С. Дельвер, Э. А. Александровна, Т. В. Шитова // Вестн. Евразийской Академии административных наук. – 2019. – № 1 (46). – С. 52 – 54.
3. Костоева, П. М. Международный Суд ООН и прогрессивное развитие международного права: дис. канд. юрид. наук: 12.00.10 / П. М. Костоева. – М., 2004. – 160 с.
4. Гузей, С. В. К вопросу о реформировании Международного Суда ООН / С. В. Гузей // Актуальные проблемы развития международного права. Тезисы докладов участников научной конференции. – М: МГЮА, 2019. – 366 с.